# Маладыя, таленавітыя, перспектыўныя

1 ▪ 8 ▪ 9 ▪ Лідскі дзяржаўны музычны каледж.
2 ▪ 3 ▪ Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў.
4–7 ▪ Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж.



1

Сетка ўстаноў пачатковай мастацка-эстэтычнай адукацыі Гродзенскай вобласці налічвае 47 школ, з якіх 8 — дзіцячыя музычныя школы мастацтваў, 37 — дзіцячыя школы мастацтваў, 2 дзіцячыя мастацкія школы мастацтваў.

Дзіцячыя школы мастацтваў прапануюць навучанне па шасці напрамках: «Музычнае», «Харэаграфічнае», «Выяўленчае», «Тэатральнае», «Народная творчасць» і «Мастацка-эстэтычнае».
Звыш 15 000 дзяцей далучаюцца тут да свету мастацтва. Ахоп музычна-эстэтычнай адукацыяй навучэнцаў 1–9 класаў агульнаадукацыйных школ Гродзенскай вобласці складае 14,4% — гэта другі паказчык у Беларусі.
Спектр адукацыйных паслуг увесь час пашыраецца праз адкрыццё новых аддзяленняў і класаў.
Штогод больш за 2,5 тысячы індывідуальных выканаўцаў і калектываў прымаюць удзел у конкурсах рознага ўзроўню.
Пошуку і развіццю творча адоранай моладзі садзейнічае спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. З моманту яго заснавання 953 навучэнцы ўстаноў сферы культуры Гродзенскай вобласці сталі стыпендыятамі фонду.
Тры сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы рыхтуюць кадры па 35 спецыяльнасцях.

Гісторыя Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў пачалася ў снежні 1947 года, калі Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб адкрыцці ў Гродне культурна-асветнага вучылішча. У 1948-м адбыўся першы набор. 71 навучэнец, большая частка з іх — былыя франтавікі, чатыры выкладчыкі, тры музычныя інструменты, замест глядзельнай залы — гараж... Так пачыналася гісторыя навучальнай установы.
Сёння ў каледжы творчую прафесію засвойваюць больш як 300 навучэнцаў па шасці спецыяльнасцях: харэаграфічнае мастацтва, народная музычная мастацкая творчасць, мастацтва эстрады, акцёрскае мастацтва, арганізацыя культурна-дасугавых мерапрыемстваў, дызайн. Штогод навучэнцы становяцца лаўрэатамі гарадскіх, міжрэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Праслаўляюць каледж і творчыя калектывы: заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца «Гарадзенскія карункі», народны аматарскі хор «Верас», народны ансамбль народных інструментаў «Рамантык-Арт», народны аматарскі калектыў эстраднай студыі «Забава», фальклорны ансамбль «Кужаль», вакальныя ансамблі «Раскоша», «Аніма», «Моладзь-Art», «Ліра»,



6



7

сто разоў станавіліся лаўрэатамі прэстыжных творчых спаборніцтваў і фестываляў, такіх як Рэспубліканскі адкрыты конкурс выканаўцаў на аркестравых інструментах імя Я.А. Глебава, адкрыты конкурс маладых выканаўцаў на аркестравых інструментах імя М.К. Агінскага, Рэспубліканскі адкрыты конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча, пераможцамі конкурсаў музычнай крытыкі і лаўрэатамі студэнцкіх канферэнцый. 87 навучэнцаў атрымалі заахвочванні Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, 12 навучэнцаў станавіліся лаўрэатамі абласной прэміі імя Аляксандра Іосіфавіча Дубко.

Славіцца каледж высокапрафесійнымі выкладчыкамі і канцэртмайстрамі. Сярод іх — доктар і два кандыдаты мастацтвазнаўства, больш за 10 магістраў, вялікая колькасць лаўрэатаў прэстыжных міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, уладальнікаў заахвочванняў Міністэрства культуры і Савета Міністраў.

Прафесійным гонарам каледжа з'яўляюцца аркестравыя і харавыя калектывы. Тры з іх былі створаны яшчэ ў 1969 годзе: заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь камерны жаночы хор (кіраўнік Марына Шарэйка); народны аматарскі калектыў народны духавы аркестр (кіраўнік Алег Галубец); народны аматарскі калектыў аркестр рускіх народных інструментаў. Крыху пазней з'явіліся народны хор (мастацкі кіраўнік Ганна Валаховіч); народны камерны аркестр (мастацкі кіраўнік Наталія Сегіневіч); аркестр баянаў (кіраўнік Анастасія Тумашык). У 1978 годзе ў каледжы быў створаны ансамбль скрыпачоў навучэнцаў. Цяпер гэта струнны квартэт навучэнцаў (кіраўнік Рэната Серафіновіч). Студэнты і выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа прымаюць удзел амаль ва ўсіх знакавых мерапрыемствах вобласці і за яе межамі. Яны станавіліся ўдзельнікамі Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Ганаровай падзеяй стала выступленне народнага аматарскага калектыву аркестра рускіх народных інструментаў музычнага каледжа з канцэртнай праграмай «Музыка збірае сяброў» у Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.

Каледж становіцца творчай пляцоўкай і для шэрагу яркіх конкурсных праектаў, сярод якіх «Духавы праспект», «Новыя імёны», Абласная музычна-тэарэтычная алімпіяда, адкрытая канферэнцыя «Дзеячы музычнай культуры Беларусі», абласны адкрыты конкурс народнага вакальна-харавога жанру «Ляці, наша песня», конкурс юных піяністаў «Юны віртуоз».

Непадалёк ад знакамітага Лідскага замка, акурат у гістарычным цэнтры горада, размясціўся Лідскі дзяржаўны музычны каледж, які нядаўна справіў 50-годдзе.

У каледжы — з дзясятак музычных калектываў, што перараслі вучэбны ўзровень і ў поўнай меры забяспечваюць канцэртнае жыццё і горада, і ўсёй Лідчыны, а таксама багата гастралююць, у тым ліку ў замежжы. Цягам толькі аднаго навучальнага года каледж правёў ажно шэсць конкурсаў — ад рэгіянальных і абласных да рэспубліканскага. Пры такім раскладзе менавіта каледж становіцца цэнтрам не толькі музычнай адукацыі, але і ўсяго развіцця музычнай культуры ў рэгіёне. Пачэсная місія!

— Мы ганарымся, што на базе нашай навучальнай установы праходзяць вельмі значныя для беларускага мастацтва падзеі, — гаворыць дырэктар Лідскага дзяржаўнага музычнага каледжа Алена Серакова, музыказнаўца, выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і магістратуры юрыдычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, лаўрэат міжнародных і ўсерасійскіх конкурсаў, лаўрэат прэміі Мітрапаліта Філарэта, Патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі, дэпутат Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання. — Гэта і Рэспубліканскі адкрыты конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя Іосіфа Жыновіча, і Абласны адкрыты конкурс імя Канстанціна Горскага з куды больш даўняй гісторыяй. А таксама шэраг іншых мерапрыемстваў, што развіваюць фестывальна-конкурсны рух і нацыянальную культуру, мастацтва ўвогуле. Конкурс Жыновіча спачатку планаваўся як вандроўны, які пераязджаў бы з месца на месца па ўсёй краіне. А пасля таго, як ён прайшоў у нас, было вырашана пакінуць яго тут назаўжды, і ў маі адбыўся ўжо 10-ы.

У гэтым ёсць свая логіка. Бо справа не толькі ў гасціннасці, спрыяльных умовах для канкурсантаў, журы і гасцей, але і ў тым, што наш каледж якраз спецыялізуецца на народных інструментах. Побач Гродна з больш развітай інфраструктурай, многія імкнуцца туды. А да нас едуць найперш выпускнікі сельскіх школ, падлеткі з няпоўных, шматдзетных сем'яў, дзе часцей запатрабаваны



8

не скрыпка ці віяланчэль, а цымбалы, домра, балалайка, гітара, баян, акардэон. Так што наш каледж — сацыяльна арыентаваны. Мы нават асобны Абласны конкурс праводзім сярод навучэнцаў сельскіх школ мастацтваў, каб заахвоціць іх працягваць заняткі. Ладзім і два розныя конкурсы аддаленага ўдзелу: адзін — у фармаце дасланых нам запісаў, другі — анлайн. Бо гэта дапамагае адсочваць найбольш таленавітых юных музыкантаў. Паступіўшы да нас, яны робяць папраўдзе неверагодны прарыў у сваёй адукацыі, культурна-інтэлектуальным узроўні, што ўзнімае агульную культуру рэгіёна. Яшчэ адзін наш прыярытэтны напрамак — духавыя інструменты. Бо духавыя аркестры ўжо ў сілу свайго гучання здаўна запатрабаваны на ўсіх святах, у тым ліку патрыятычнай тэматыкі. Гэта не значыць, што ў нас не выкладаюць музыказнаўства, ігру на фартэпіяна ці тых жа струнных смычковых — выкладаюць, і вельмі добра! Ёсць і ўшанаваны шматлікімі ўзнагародамі камерны аркестр каледжа. Але большасць абітурыентаў імкнецца авалодаць больш дэмакратычнымі на сёння відамі музыцыравання. Натхняюць іх і выступленні нашых калектываў. Два аркестры народных інструментаў маюць добрую замежную практыку, неаднаразова перамагалі на шматлікіх міжнародных фестывалях, рэгулярна выступаюць па ўсім рэгіёне. Духавы аркестр — удзельнік усіх патрыятычных мерапрыемстваў. Асабліва многа канцэртаў было і яшчэ будзе ў новым навучальным годзе да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы рыхтавалі праект «Наша памяць мацнейшая за час», дзе была і музыка з фільмаў пра вайну, і песенная праграма пра Вялікую Айчынную, што суправаджаліся відэапраекцыямі, аповедамі пра родных і блізкіх, якія годна прайшлі тое ліхалецце.

У патрыятычным выхаванні мы шчыльна супрацоўнічаем з пракуратурай, райаддзелам унутраных спраў і іншымі падобнымі ведамствамі. Наш каледж пакуль адзіны ў краіне, які заключыў дамову аб супрацоўніцтве з Мінскай духоўнай семінарыяй, што ў Жыровічах. Гэта дапамагае ладзіць разнастайныя сумесныя мерапрыемствы духоўнага кірунку, семінары, канцэрты салістаў і калектываў — найперш камернага жаночага хору, вакальнага ансамбля «Вербіца».

У сакавіку ў нас адбыўся XXX Абласны адкрыты конкурс імя Канстанціна Горскага. Ураджэнец Ліды, Горскі стаў знаным скрыпачом і кампазітарам мяжы XIX — XX стагоддзяў, аўтарам больш як сотні камерных твораў, гістарычнай оперы «Маргер» пра барацьбу з тэўтонцамі, сябраваў з Чайкоўскім, быў выканаўцам яго скрыпічных твораў, той нават раіўся з ім пры напісанні струнных квартэтаў. Адно тое, што конкурс носіць яго імя і тым самым папулярызуе яго творчасць, становіцца дадатковым актам патрыятычнага выхавання моладзі. А колькі ўвогуле беларускай музыкі ў нас гучыць! Запрашаем і вядучых кампазітараў на творчыя сустрэчы. Зараз рыхтую юбілейную вечарыну да 95-годдзя з дня нараджэння Яўгена Глебава — з запрашэннем яго ўдавы і прадстаўнікоў Беларускага саюза кампазітараў. Багатая канцэртна-конкурсная дзейнасць каледжа магчымая толькі таму, што ў нас склаўся выдатны, высокапрафесійны выкладчыцкі калектыў, што не баіцца ініцыятывы, адказнасці і здольны на многае. Наперадзе — шмат планаў. Асноўныя звязаны са святкаваннем 80-годдзя Вялікай Перамогі. Да гэтай даты сумесна з Беларускім саюзам музычных дзеячаў, Лідскім благачыннем і Мінскай духоўнай семінарыяй рыхтуецца праект «Памяць і творчасць: код — духавыя». Аркестр беларускіх народных інструментаў будзе выступаць з пераможцамі конкурсу Жыновіча розных гадоў, папулярызуючы нацыянальную спадчыну. Шэраг канцэртных праграм прысвяцім 80-годдзю Гродзенскай вобласці. Суцэльная чарада міжнародных конкурсаў і фестываляў чакае духавы аркестр: у Мінску гэта будуць «Кубак Еўропы», «Легенда», «Мінск — сузор'е талентаў», у Салігорску — Jazz-time, за мяжой — у Маскве — «Калейдаскоп талентаў» і «Дзень Расіі!», у Санкт-Пецярбургу — «Паўночная Венецыя», «Пецярбургская вясна», а таксама конкурсы імя Стравінскага, Лядава, у Пскове — «Адкрытыя старонкі». Запланаваны абменныя канцэрты з Санкт-Пецярбургскім музычным каледжам імя Рымскага-Корсакава. Мы адкрытыя да супрацоўніцтва!



9

*Падрыхтавалі*
*Вера Нікалаева і Надзея Бунцэвіч.*